эпіграфаў – беларускія мысляры і творцы ад Сярэднявечча, Рэнесансу, Рэфармацыі, Асветніцтва да нашых дзён. Гэта ўсё дапамагае пабачыць, што ідэі і вобразы, на якіх грунтуецца старажытнае аўтэнтычнае мысленне, не знікаюць з развіццём культуры і прагрэсу, не адкідаюцца як аджылыя наўзбоч культуры, але працягваюць фарміраваць нацыянальны інтэлектуальны дыскурс, утвараючы непарарыўны культурны дыялог, супольны і індывідуальны роздум над асноўнымі пытаннямі, што вярэдзяць усе пакаленні нацыянальнай супольнасці. Такім чынам ствараецца аб'ёмная карціна беларускага светамыслення і светаадчування, якая заангажоўвае чытача, набліжае яго да разумення інтэлектуальнай глыбіні беларускай народнай філасофіі і складанасці нацыянальнай ідэнтычнасці.

У кнізе пяць частак: «Сам-насам з Сусветам» (Беларуская этнакасмалогія), «На Беларусі Бог жыве» (Беларуская этнатэалогія), «О чалавек, ніхто не змераў глыб тваю!» (Беларуская народная антрапалогія), «У агромністай такой грамадзе» (Грамадскі лад у светапоглядзе беларусаў), «Гэта скарб нам на вечныя годы» (Беларуская этнааксіялогія) і больш за 170 унутраных загалоўкаў.

Сёння ў Беларусі, як ніколі, акрэсліўся сацыяльны запыт на даследаванне нацыянальнай ідэнтычнасці і на асэнсаванае фарміраванне яе духоўна-светапоглядных асноў. У гэтым запыце значнасць і актуальнасць праекта «Беларуская этнафіласофія ў сістэме нацыянальнай культуры» відвочная. Ён можа стаць важным унёскам у сёняшні працэс інтэлектуальных і культурных зрухаў, што адбываецца ў краіне, дапаможа яму стаць больш усвядомленым, больш глыбокім і знайсці сваё месца ў сусветным часава-прасторавым кантэксце. ■

# АВАНС НА БУДУЧЫНЮ



**Сярод таленавітых маладых навукоўцаў, якім прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2021 г., – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі Яўген Сакоўскі. Да вашай увагі – думкі маладога вучонага аб абранай прафесіі і планах на будучыню.**

Нельга сказаць, што я на працягу ўсяго жыцця марыў стаць філосафам. Хаця тэарэтычныя даследаванні пачалі цікавіць мяне падчас вучобы ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Па базавай адукацыі я палітолаг-менеджэр, скончыў бакалаўрыят і магістратуру па гэтым накірунку. І тут важна нагадаць пра кандыдацкі экзамен па філасофіі ў канцы навучання магістратуры, які быў здадзены добра. На маю думку, гэта паўплывала на далейшае развіццё падзей.

Праз некаторы час мне патэлефанавала доктар філасофскіх навук, прафесар Яскевіч Ядвіга Станіславаўна, на той час дэкан Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі БДЭУ, і прапанавала паступіць у аспірантуру філасофскага напрамку. У выніку я яе скончыў, застаўся працаваць у Інстытуце філасофіі і пакуль ні разу не пашкадаваў аб гэтым. Можна абагульніць вышэйсказанае тым, што мая прафесія вызначылася праз злучэнне волі выпадку з пэўным унутраным адчуваннем сваіх здольнасцей.

Што да ролі настаўніка ці аўтарытэтнага навукоўца ў выбары прафесіі або навуковага напрамку, то відавочна, што яна вельмі важная, але ў той жа час яе нельга перабольшваць. Тым больш у галіне філасофіі. Ёсць меркаванне, што ўся гісторыя філасофіі – гэта адна вялікая спрэчка ўсіх са ўсімі, якая працягваецца прыблізна 2500 гадоў. Я часткова згодны з гэтай думкай. Калі б

у развіцці гэтай навукі вырашальную ролю адыгрывала прызнанне аўтарытэтаў (у патрыярхальным разуменні дадзенай фразы), то мы зараз пісалі б толькі адныя каментары да Платону і не з'явілася б ніякіх іншых аўтарытэтаў вышэй за яго. Калі ісці далей у дадзенай парадыгме мыслення, то ні Кант, ні Маркс, ні Ніцшэ, ні Фуко не набылі б тую бліскучасць, веліч і вядомасць, што яны маюць цяпер. Таму ў межах філасофіі разважаць пра аўтарытэт можна вельмі ўмоўна. Так, чытаць знакамітых філосафаў, разбірацца ў іх ідэях заўсёды будзе добрым тонам, але зусім не абавязкова па ўсіх пытаннях з імі салідарызавацца. Першае і апошняе словазлучэнне ў філасофіі – рэальная свабода думкі. Пры яе наяўнасці само паняцце аўтарытэта размываецца і ўвогуле пазбаўляецца ўсялякай формы.

Варта мовіць, што кожны спецыяліст выбірае прафесію з улікам розных прычын. Уплыў настаўніка ці аўтарытэтнага спецыяліста з'яўляецца не адзінай падобнай умовай. І менавіта ў гэтым заключаецца яе асаблівы шарм. Для мноства маладых навукоўцаў настаўнік падобны да лесвіцы, ён сімвалізуе мэту, метад і перспектыўны вынік іх кар'еры. Хоць перад вачыма і ёсць лесвіца, але як на яе ўзбірацца, з якой хуткасцю, пераскокваць прыступкі ці не, з адкатамі назад ці без адката – залежыць толькі ад самога маладога навукоўца. Амаль тая ж гісторыя з аўтарытэтным вучоным (ці філосафам), за выключэннем таго, што ён зможа дапамагчы і падцягнуць асабіста цябе. Выдатна канешне, калі твой настаўнік аднначасова і выбітны навуковец, як гэта атрымалася ў мяне. Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Ігар Міхайлавіч Бабкоў (мой навуковы кіраўнік) – дастаткова вядомы філосаф не толькі ў Беларусі, але, напэўна, ва ўсёй Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Нягледзячы на гэта, я не магу сказаць, што з'яўляюся пераемнікам ці прадаўжальнікам яго філасофскіх ідэй. Магчыма, нават наадварот, у мяне супрацьлеглы позірк на многія рэчы. Між іншым падобныя адносіны ў філасофіі – цалкам нармальная з'ява.

Настаўнікі і аўтарытэты ў філасофіі мне ўяўляюцца вельмі каштоўным рэсурсам, які можна выкарыстоўваць для свайго развіцця ў прафесіі. Можна, аднак не абавязкова. Мяжы дасканаласці тут няма, як і адназначна правільнага шляху. У любым выпадку кожны навуковец ці філосаф, у якога ёсць чаму навучыцца, заслугоўвае павагі. Тым не менш з ім пры неабходнасці можна і трэба спрачацца, у тым ліку пісьмова, з дапамогай артыкулаў, часопісаў і мовы навукі.

Прадметная вобласць маіх даследаванняў – вывучэнне гісторыі філасофіі. У мяне 2 прыярытэтных напрамкі: будысцкая філасофія і нацыянальная беларуская філасофія. У межах апошняй зараз вывучаю дактрыну народніцтва і яе ўплыў на беларускае грамадства ў канцы XIX – пачатку XX ст. Даследуючы гэты перыяд, можна даведацца пра мноства цікавых рэчаў, якія і ў наш час да некаторай ступені актуальныя. Напрыклад, вядома, што ў канцы XIX ст. народнікі прытрымліваліся ліберальных і сацыялістычных поглядаў. Аднак на шэраг важных пытанняў (у тым ліку на нацыянальнае) адказ менавіта беларускіх прадстаўнікоў гэтай плыні больш падобны да нацыяналізму і ўмеранага кансерватызму. Увогуле народніцтва сумяшчае ў сабе тэзісы розных палітычных ідэалогій і філасофскіх дактрын. Дадзеная сітуацыя ўзаемапранікнення і суіснавання ідэй, якія лічацца амаль супрацьлеглымі, завецца ідэалагічнай інверсіяй. Яе ўздзеянне на чалавека і грамадства я даследую па працах М.К. Судзілоўскага-Руселя.

Гэты філосаф і рэвалюцыянер беларускага паходжання меў эклектычныя філасофскія погляды, нягледзячы на сімпатыі да сацыялізму. Ён з'яўляецца тыповым інтэлектуалам, які дзіўным чынам спалучае ў творчасці супярэчлівыя ідэйныя напрамкі. Больш за тое, трэба разумець, што дадзеная асаблівасць была характэрна для многіх іншых выбітных асоб таго часу. І калі зараз гэта, насамрэч, звыклая з'ява, то 100–130 гадоў таму філасофская эклектыка была чымсьці незвычайным і не даследаваным. У выніку такая непаслядоўнасць у поглядах была шырока распаўсюджана і потым, на этапе з'яўлення палітычных партый (1890-я гг.). Таму можна казаць, што ідэалагічная інверсія адыграла важную ролю ва ўтварэнні палітычнага вакууму напярэдадні Першай рускай рэвалюцыі (1905–1907 гг.).

За даследаванне народніцтва і аналіз пэўных асаблівасцей гэтай ідэалагічна-філасофскай плыні я атрымаў стыпендыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам. Гэта сур'ёзная фінансавая падтрымка, аванс на будучыню і дадатковая матывацыя для плённай працы.

Дадзены аналіз прывёў у выніку да аўтарскай тэорыі, якая робіць спробу даць адказ на пытанне, як і чаму генезіс палітычных і філасофскіх ідэй абавязкова на пэўных этапах сустракаецца з унутранымі супярэчнасцямі. Даследаванне ідэалагічнай інверсіі, яе прычын, праяў і наступстваў, а таксама вывучэнне яе на прыкладзе творчасці М.К. Судзілоўскага-Руселя складае ядро маёй кандыдацкай дысертацыі. У хуткім часе планую выходзіць з ёю на абарону. Спадзяюся, што ў далейшым буду развівацца як навуковы супрацоўнік і змагу ўнесці свой невялічкі ўклад у філасофію.

Материалы рубрики подготовила Ирина ЕМЕЛЬЯНОВИЧ